# Зубры сыходзяць, трэба іх вярнуць

**Як праект "Ветландс" плануе захоўваць рэдкія віды жывел, і навошта нам патрэбны галандскія тарпаны**

**Налібоцкая пушча – першае ў Беларусі месца, дзе ў свой час была створана папуляцыя зуброў, якія жывуць на волі (дагэтуль рэдкіх жывёл трымалі ў вальерах). І калі 20 гадоў таму яна бесперапынна расла, то сёння паказчыкі нараджальнасці знізіліся да нуля. Акрамя таго, жывёлы пачалі пакідаць лясны масіў і выходзіць "улюдзі". Прычын такіх змен некалькі, але асноўныя – недахоп ежы і зарастанне тэрыторый, на якіх зубры пасвяцца, упэўнены спецыялісты.**

Вырашыць праблемы павінен пяцігадовы праект «Устойлівае кіраваннеляснымі і вод- на-балотнымі экасістэмамі для дасягнення шматмэтавых пераваг» («Ветландс»), які фінансуецца Глабальным экалагічным фондам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН сумесна з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

—Наша задача — захаваць і аднавіць месцапражыванні раслін і жывёл, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення, а таксама палепшыць кармавыя ўгоддзі для вольна жывучай налібоцкай мікрапапуляцыі зуброў, — адзначае **начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Мікалай СВІДЗІНСКІ.** — Сёння там 200 га тэрыторыі знаходзіцца ў дэ- структыўным стане. Зубры сыходзяць, трэба іх вярнуць.

Для гэтага плануецца стварыць канвеер, які забяспечыць жывёл зялёнымі кармамі з ранняй вясны да позняй восені, а таксама ацаніць генетычны патэнцыял зуброў і, па магчымасці, аздаравіць папуляцыю.

—Зубра можна назваць ляснoй каровай. А ў беларускіх лясах амаль не засталося адкрытых участкаў з зялёнай раслiннасцю, якія б не зараслі хмызнякамі. Зарасла і вада. Мы плануем расчысціць каля 300 га і пракантраляваць, каб гэтыя мерапрыемствы праводзіліся рэгулярна, — падкрэсліў **загадчык сектара міжнароднага супрацоўніцтва і суправаджэння прыродаахоўных канвенцый НПЦ па біярэсурсах НАН Беларусі, навуковы каардынатар праекта Аляксандр КАЗУЛІН.**

Па словах спецыяліста, у рамках праекта таксама будзе працягнута дзейнасць па выдаленні расліннасці з нізінных балот і пойменных лугоў, у тым ліку на тэрыторыі заказнікаў «Спораўскі» і «Званец», якая была распачата яшчэ падчас праекта «Кліма-Іст». Вядома, без ува- гі не застанецца і Тураўскі луг — унікальная тэрыторыя, праз якую пралягаюць міграцыйныя шляхі соцень тысяч птушак, у тым ліку і рэдкіх.

— На працягу 20 гадоў мы маніторым колькасць птушак на пойменных лугах. І з кожным годам іх іх становіцца ўсё менш. Так, амаль у два разы скарацілася колькасць кулікоў, практычна зніклі марадункі і кнігаўкі (а гэта не глабальна пагражаемы від), — падкрэсліла **вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі арніталогіі НПЦ па біярэсурсах Наталля КАРЛІЁНАВА.** — Безумоўна, прынятыя меры, напрыклад, кіруемае выпальванне сухой расліннасці, паляпшаюць сітуацыю, але без комплекснага падыходу станоўчы эфект доўга не працягнецца. Вось не стала ў прыватных гаспадарках кароў, перасталі мясцовыя жыхары пасвіць жывёл на пойменным лузе — і ён зарос.

Дарэчы, свойскім жывёлам, своеасаблівым «санітарам» лугоў, якіх сёння ў многіх месцах для выканання гэтай місіі не хапае, у праекце «Ветландс» прадугледжана цікавая альтэрнатыва. Аляксандр Казулін расказаў, што ў хуткім часе ў Беларусі могуць з'явіцца вольна жывучыя тарпаны і турападобныя каровы. Жывёл плануецца прывезці з Галандыі, дзе іх паспяхова разводзяць ужо на працягу некалькіх гадоў. Так што хутка ў нашых зуброў з'явіцца цікавая кампанія.

**Іcточнік:** Звязда. – 2018. – 16 сак. (№ 51). – С. 1, 4.